УДК 94(476) “15/16”

# ЯЗЭП РУЦКІ: ПАЛЕМІСТ І РЭФАРМАТАР

**Г. А. Попчанка**
студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта
Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь
E-mail: *popchenko.0101@mail.ru*
**М. М. Шчэрбін**
кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры гісторыі і грамадазнаўчых дысцыплін
Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь
E-mail: *marina.sherbin@mail.ru*

*У артыкуле разглядаюцца постаць Язэпа Вельяміна-Руцкага як палеміста і рэфарматара, яго роля ў вырашэнні рэлігійных пытанняў у беларускім грамадстве другой паловы XVI – пачатку XVII стст. Ахарактарызаваны асноўныя этапы жыцця Я. В. Руцкага. Адзначаны ключавыя напрамкі дзейнасці, сярод якіх вылучаецца місіянерская справа, упарадкаванне ўніяцкай патрыярхіі, стварэнне базыльянскага ордэна. Выяўлены філасофска-палемічныя погляды мітрапаліта па пытаннях упарадкавання грамадства, вырашэння рэлігійных супярэчнасцей сярод вернікаў у Рэчы Паспалітай, рэарганізацыі сістэмы адукацыі. Акрэслены талерантная пазіцыя і дэмакратычныя погляды Я. В. Руцкага.*

***Ключавыя словы:*** *рэфарматар, палеміст, уніяцкая царква, місіянерская дзейнасць, базыльянскі ордэн.*



МГПУ им. И.П. Шамякина

## JOSEPH RUTSKY: POLEMICIST AND REFORMER

**A. A. Popchenko**
3rd year student of the Faculty of Philology of the Mozyr State
Pedagogical University named after I. P. Shamyakin,
Mozyr, Republic of Belarus
E-mail: *popchenko.0101@mail.ru*
**M. M. Shcherbin**
Candidate of Pedagogical Sciences, Head of the Department of History and Social Sciences
of the Mozyr State Pedagogical University named after I. P. Shamyakin,
Mozyr, Republic of Belarus
E-mail: *marina.sherbin@mail.ru*

*The article examines the figure of Joseph Velyamin Rutsky as a polemicist and reformer, his role in solving religious issues in Belarusian society in the second half of the XVI-early XVII centuries. Describe the key stages of the life cycle of E. V. Rutskoi. The key areas of activity are noted, among which the missionary work, the ordering of the Uniate Patriarchate, and the creation of the Basilian Order are highlighted. The metropolitan expressed his philosophical and polemical views on the issues of ordering society, resolving religious contradictions among believers in the Polish-Lithuanian Commonwealth, and reorganizing the education system. E. V. Rutsky's tolerant position and democratic views are outlined.*

***Keywords:*** *reformer, polemicist, Uniate Church, missionary activity, Basilian Order.*

**Уводзіны.** Постаць Язэпа Вельяміна-Руцкага займае адно з ключавых месцаў у гісторыі беларускага грамадства першай трэці XVII ст. Уніяцкі мітрапаліт, заснавальнік базыльянскага ордэна, выдатны палеміст і рэфарматар, ён здолеў вывесці "ўсходнюю" царкву Рэчы Паспалітай з сістэмнага крызісу, які назіраўся ў другой палове XVI – пачатку XVII стст. [3, с. 12]. За літаратурнай палемікай Руцкага з полацкім праваслаўным архіепіскапам Мялеціем Сматрыцкім сачыла ўсё грамадства Рэчы Паспалітай [1].

**Мэтай** артыкула з'яўляецца вывучэнне дзейнасці і творчай спадчыны Я. В. Руцкага.

**Метады.** У працэсе даследавання выкарыстоўваліся наступныя метады: параўнальна-супастаўляльны, сістэмны, гісторыка-храналагічны, з дапамогай якіх вызначаны асноўныя аспекты дзейнасці Я. В. Руцкага, яго погляды на рэлігійныя працэсы тагачаснага грамадства, філасофскія ідэі, палемічная спадчына.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Іван (у манастве – Язэп) Вельямін-Руцкі нарадзіўся ў другой палове 1574 г. (альбо пачатку 1575 г.), належаў да шляхецкага роду. Большасць даследчыкаў сыходзіцца ў тым, што род Вельямінаў паходзіць з тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы. Большасць біяграфічных нарысаў пра Язэпа Вельяміна-Руцкага пачынаецца са згадкі таго факту, што ён быў сынам кальвініста Фелікса Вельяміна-Руцкага і яго жонкі Багумілы Корсак. Ад радавога маёнтка Рута, які знаходзіўся на тэрыторыі Навагрудскага павета Вялікага Княства Літоўскага, Вельяміны паступова пачалі называцца Вельямінамі-Руцкімі. Пачатковую адукацыю падлетак атрымаў у першай палове 80-х гадоў у навагрудскіх анабаптыстаў, затым у Віленскай кальвінскай школе.

Нейкі час ён слухае лекцыі ў славутым Пражскім Карлавым універсітэце. Пасля смерці бацькі (1590 г.) Язэп Руцкі адправіўся ў Вюрцбург для завяршэння адукацыі. Пазней накіраваўся ў Рым, дзе вучыўся ў калегіі св. Афанасія. У 1603 г. ён з Рыма вяртаецца на радзіму, адкуль з адным пасольствам падарожнічаў у Маскву. У 1608 г. уніяцкі мітрапаліт Іпацій Пацей прызначыў яго спачатку сваім намеснікам, а затым архімандрытам Віленскага Траецкага манастыра. У 1613 г. памёр Іпацій Пацей і на яго месца быў прызначаны Язэп Вельямін-Руцкі, які атрымаў зацвярджэнне ад папы ў званні мітрапаліта толькі праз год, у чэрвені 1614 г. Язэп Вельямін-Руцкі на працягу 23 гадоў кіраваў заходнярускай царквой [4, с. 895].

Як вызначаюць даследчыкі, у дзейнасці Язэпа Руцкага вылучаюцца тры асноўныя "праекты": місіянерская дзейнасць у Маскве пры двары цара Дзмітрыя І, стварэнне самастойнай Кіеўскай уніяцкай патрыярхіі, стварэнне базыльянскага ордэна. Два першыя праекты мелі на мэце аб'яднанне праваслаўных і ўніяцкіх жыхароў Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы ў складзе новай, Кіеўскай, патрыярхіі.

У 1606 г., захапіўшыся місіянерскай ідэяй, Я. В. Руцкі накіроўваецца ў Маскву, дзе ўбачыў магчымасць рэалізаваць сябе, ажыццявіць свае задумы ўдасканалення Хрыстовай царквы. На маскоўскім пасадзе на той момант знаходзіўся цар Дзмітрый І, які ў 1605 г. прывёў у Маскву беларускія і польскія вайсковыя аддзелы. Я. В. Руцкі меў цесныя стасункі з новым маскоўскім гаспадаром і неаднаразова прапаноўваў яму накіроўваць юнакоў па навуку ў Вялікае Княства Літоўскае з тым, каб пасля, з іх дапамогай, праводзіць дзяржаўныя і царкоўныя пераўтварэнні ў Маскоўскім княстве. Але і ў Маскве здзейсніць свае задумы Я. В. Руцкі не змог, бо ўлада Дзмітрыя І неўзабаве пахіснулася, пачаліся ўнутраныя забурэнні, у выніку якіх цар быў забіты, а ў Маскоўскім княстве наступіў "смутны час" [10, с. 379].

Па ўзыходзе на мітраполію Я. Руцкі разгарнуў яшчэ большую дзейнасць, накіраваную на ўмацаванне ўніяцкай царквы, у якую на той момант уваходзілі 5 буйных царкоўна-адміністрацыйных адзінак – архіепіскапіяў: Полацкая, Уладзімірская, Пінская, Холмская і Смаленская. Ён найперш пачаў дамагацца палітычных правоў для ўніяцкай царквы, увядзення яе найвышэйшых іерархаў у склад Рады – найвышэйшага выканаўча-распарадчага органа Вялікага Княства Літоўскага [10, с. 381].



МГПУ им. И.П. Шамякина

Я. В. Руцкі таксама спрабаваў падпарадкаваць уніяцкай царкве праваслаўныя асяродкі Кіева, найперш славутую Кіева-Пячорскую лаўру. Працяглае змаганне ўніятаў за лаўру скончылася безвынікова; яна засталася ў руках праваслаўных [10, с. 382].

Пасля працяглых філасофскіх разважанняў Я. В. Руцкі прыйшоў да высновы, што напружаныя дачыненні паміж праваслаўнымі і ўніятамі ў Княстве можна грунтоўна ўрэгуляваць толькі праз утварэнне Патрыярхіі ў ВКЛ. Такім чынам, галоўную мэту ўтварэння Патрыярхіі Я. В. Руцкі бачыў у дасягненні кансалідацыі ўсіх вернікаў усходняга абраду, ліквідаванні інстытуцыянальных і дактрынальных падставаў для грамадскага напружання на рэлігійнай глебе. Аднак грандыёзны праект Патрыярхіі – найвышэйшага інстытута ўлады для вернікаў усходняга абраду – не быў ажыццяўлёны з-за шматлікіх прычын [10, с. 383].

Акрамя таго, Я. В. Руцкі выявіў сябе як выдатны літаратар, майстра мастацка-публіцыстычнага слова, філосаф і аналітык. Закранаючы на старонках сваіх твораў праблему ўзаемадачыненняў паміж свецкай і духоўнай уладамі, Я. В. Руцкі схіляўся на бок дактрыны аб прыярытэтнасці свецкіх уладаў у краіне. У “Падвойнай віне” ён падкрэсліваў, што “ў многіх хрысціянскіх краінах – Грэцыі, Балгарыі, Сербіі, Валахіі, Масковіі ніхто без дазволу манарха не можа займаць пасады мітрапалітаў і епіскапаў” [5]. Я. В. Руцкі абгрунтоўваў антызаконнасць узнаўлення праваслаўнай мітраполіі ў ВКЛ. У творы “Экзамен абароны” пісьменнік-палеміст раскрытыкаваў праваслаўную дактрыну, рэзка асудзіў “разбуральную” дзейнасць праваслаўнага святарства, назваўшы М. Сматрыцкага чалавекам “абмежаваных здольнасцяў”, які імкнецца “сцвярджаць ісціну не фактамі і аргументамі, а непрыстойнай лаянкай і абразамі” [2].

Я. В. Руцкі сфармуляваў пяць асноўных антытэзісаў супраць узнаўлення праваслаўнай іерархіі Вялікага Княства Літоўскага. У сваіх творах пісьменнік даводзіў, што ў ВКЛ здаўна існуе закон, паводле якога, менавіта манарх прызначае (“прэзентуе”) на найвышэйшыя духоўныя пасады ў Княстве, а патрыярх толькі робіць пасвячэнне [10, с. 383].

Асаблівасць кіравання Я. В. Руцкага заключалася ў тым, што ён жадаў распаўсюджваць і сцвярджаць унію ў Заходняй Русі не знешнімі мерамі, не гвалтам і захопамі, а паляпшэннем яе ўнутранага стану. З гэтаю мэтай ён у 1617 г. паклаў падставу базыльянскаму ўніяцкаму ордэну, які быў заснаваны па ўзоры каталіцкіх манаскіх ордэнаў [7]. Усе заходнярускія агульнажыльныя манастыры яшчэ да ўніі ўладкаваліся па адным галоўным статуце – статуце св. Васіля Вялікага; але яны мелі таксама і свае прыватныя статуты і яшчэ больш таго падзяляліся тым, што, знаходзячыся ў розных епархіях, падпарадкоўваліся кожны толькі свайму настаяцелю і свайму епархіяльнаму ўладыку.

У такім выглядзе заходнярускія праваслаўныя манастыры перайшлі ў рукі ўніятаў. Па плане мітрапаліта Я. В. Руцкага ўсе ўніяцкія манастыры павінны аб'яднацца ў адзін агульны манастыр, разам з Віленскім Свята-Траецкім, і з усіх уніяцкіх манахаў утварыць адно брацтва. На з'ездзе ў Навагародавічах пастаноўлена было, што ўсё ўніяцкае манаства ў Літве вызваліць з-пад улады епархіяльных архірэяў і ўтварыць адно самастойнае таварыства пад імем ордэна Базыльянскага, г. зн. св. Васіля Вялікага [3]. Падпарадкоўваўся ён толькі аднаму папе. У склад Базыльянскага ордэна маглі ўступаць і лаціняне. На чале ордэна стаяў генерал-протаархімандрыт з асаблівымі дарадцамі, якія абіраліся з суполкі самога ордэна [6].

В. Руцкі лічыў, што базыльяне павінны былі клапаціцца аб распаўсюджванні ўніі і збліжэнні яе з лацінствам. Для дасягнення гэтай мэты базіліяне павінны былі распаўсюджваць свой уплыў на грамадства, замяшчаючы сваімі супрацоўнікамі ўсе вышэйшыя царкоўна-парафіяльныя месцы і пасады. Пастаноўлена было абіраць біскупаў і мітрапаліта для ўніятаў з асоб, якія належаць да Базыльянскага ордэна. Пры сваім прысвячэнні біскупы давалі клятву ніколі не выходзіць з паслушэнства ордэну [1].

Язэп Руцкі ў 1626 г. заснаваў семінарыю для падрыхтоўкі кандыдатаў уніяцкага духавенства [4]. Неўзабаве па ўзроўні адукацыі ўніяцкія школы зраўняліся з лепшымі на той час езуіцкімі школамі. Для выкладання Я. В. Руцкі запрашаў прафесараў з іншых навучальных устаноў, сам складаў навучальныя праграмы. Не толькі навукам хацеў навучаць ён моладзь, але і святасці. “Патрэбныя настаўнікі не толькі ў навуцы, але ў дабрачэснасці і дабрадзейнасці”, – меркаваў В. Я. Руцкі [8]. Навучальныя ўстановы ўніяцкай царквы фарміравалі інтэлігенцыю Беларусі. З іх дапамогай была створана новая фармацыя духавенства. З ростам яго ведаў узрастала рэлігійная свядомасць вернікаў, большасць якіх іншымі крыніцамі асветы не маглі карыстацца [8].

Я. В. Руцкі памёр 5 лютага 1637 г. у Дзерманскім манастыры. Гады мітрапалітавання Язэпа Руцкага складаюць, па агульным прызнанні каталіцкіх і ўніяцкіх гісторыкаў, выдатную эпоху ў гісторыі заходнярускай уніі. Калі першыя два ўніяцкія мітрапаліты (Міхаіл Рагоза і Іпацій Пацей) клапаціліся больш за ўсё аб знешнім распаўсюджванні ўніі, то Язэп Руцкі звяртаў галоўную ўвагу на ўнутранае ўмацаванне. Лепшае сведчанне і ацэнку дзейнасці ўніяцкага мітрапаліта дае папа Урбан VIII, называючы яго ў сваёй буле “Атлантам уніі”, “рускім Афанасем” [9].

**Высновы.** Не ўсё задуманае ажыццявіў Язэп Руцкі, але і зробленае ім стала трывалым падмуркам, на якім больш за два стагоддзі стаяла ўніяцкая царква, якая была “народнай царквой” большасці беларусаў і дазволіла ім захаваць сваю нацыянальную адметнасць. Заснаваны Руцкім Ордэн базыяльнаў адыграў адметную ролю ў духоўным жыцці Беларусі, яе культуры, мастацтве, дойлідстве.

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Морозова, С. В. Полемическая литература конца XVI – первой половины XVII в. [Электронный ресурс] / С. В. Морозова – Режим доступа: http://pawet.net/library/history/bel_history/marozava/98/1/3/09/Полемическая_литература_конца_XVI_-_первой_половины_XVII_в..html. – Дата доступа: 22.12.2020.

2. Жукович, П. Н. Жизнеописание митр. Иосифа Вельямина-Рутского, составленное митр. Рафаилом Корсаком, и сочинение Рутского об улучшении внутреннего строя униатской церкви [Электронный ресурс] / П. Н. Жукович – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/zhizneopisanie-mitr-iosif-velyamina-rutskogo-sostavlennoe-mitr-rafailom-korsakom-i-sochinenie-rutskogo-ob-uluchshenii-vnutrennego. – Дата доступа: 21.12.2020.

3. Лисейчиков, Д. В. Завещание митрополита Иосифа Вельямина-Рутского [Электронный ресурс] / Д В. Лисейчиков – Режим доступа: http://pawet.net/library/history/bel_history/lis/29/Завещание_митрополита_Иосифа_Вельямина-Рутского.html. – Дата доступа: 22.12.2020.

4. Православная богословская энциклопедия или Богословский энциклопедический словарь : под ред. проф. А. П. Лопухина: в 12 томах. – Петроград : Т-во А. П. Лопухина, 1900–1911. – Т. 7: Иоанн Скифопольский – Календарь : с 18 рисунками и картами. – 1906. – VII, 892 стб., 893–913 с.

5. Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве, с древнейшего до настоящего времени (Глава III) / Г. Я. Киприанович [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://zapadrus.su/bibli/istfbid/1229-g-ya-kiprianovich-istoricheskij-ocherk-pravoslaviya-katolichestva-i-unii-v-belorussii-i-litve-s-drevnejshego-do-nastoyashchego-vremeni-glava-iii.html. – Дата доступа: 21.12.2020.

6. Зноско, К. И. Исторический Очерк Церковной Унии. Ее Происхождение и характер [Электронный ресурс] / К. И. Зноско – Режим доступа: https://bookitut.ru/Istoricheskij-ocherk-Czerkovnoj-unii-Ee-proiskhozhdenie-i-kharakter.36.html#a36.Glava-XI-XVI. – Дата доступа: 20.12.2020.

7. Чаропко, В. К. Язэп Руцкі (1574–1637) [Электронный ресурс] / В. К. Чаропко. – Режим доступа: http://zviazda.by/be/news/20190520/1558361869-yazep-rucki-stvaralnik-uniyackay-carkvy. – Дата доступа: 22.12.2020.

8. Морозова, С. В. Униатская система образования [Электронный ресурс] / С. В. Морозова. – Режим доступа: http://belchrist.narod.ru/pages/1_kanf_hist/16-18/uniackaja_adukac.htm. – Дата доступа: 22.12.2020.

9. Саверчанка, I. В. Руцкі Язэп [Электронный ресурс] / I. В. Саверчанка. – Режим доступа: http: //pawet.net/library/o_reflections/08b/Руцкі_Язэп.html. – Дата доступа: 28.01.2020.

10. Саверчанка, I. В. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / I. В. Саверчанка. – Мінск : «Кнігазбор», 2007. – 608 с.

**References**

1. Morozova, S. V. polemical literature of the end of the XVI – first half of the XVII century [electronic resource] / S. V. Morozova // pawet.net. – Access mode: http://pawet.net/library/history/bel_history/marozava/98/1/3/09/Полемическая_литература_конца_XVI_ – первой_половины_XVII_в.html. – Access date: 22.12.2020. (In Russ).

2. Zhukovich, P. N. life description of Mitr. Joseph Velyamin-Rutsky, compiled by Mitr. Raphael Korsak, and the creation of Rutsky on improving the internal structure of the Uniate church. [Electronic resource] / P. N. Zhukovich // cyberleninka.ru. – Access mode: https://cyberleninka.ru/article/n/zhizneopisanie-mitr-iosif-velyamina-rutskogo-sostavlennoe-mitr-rafailom-korsakom-i-sochinenie-rutskogo-ob-uluchshenii-vnutrennego. – Access date: 21.12.2020. (In Russ).

3. Liseychikov, D. V. testament of Metropolitan Joseph Velyamin-Rutsky [Electronic resource] / D. V. Liseychikov // pawet.net. – Mode доступа: http://pawet.net/library/history/bel_history/lis/29/ Bequest of Metropolitan Josef Velyamin-Rutsky.html. – Access date: 22.12.2020. (In Russ).

4. Orthodox Theological encyclopedia or theological encyclopedia. : edited by Prof. A. P. Lopukhin: in 12 volumes. Petrograd: t–Vo A. P. Lopukhina, 1900–1911. / Vol. 7: John of Scythopolis – calendar : with 18 drawings and maps. – 1906. – VII, 892 STB., 893–913 P. (In Russ).

5. Kiprianovich, G. YA. Historical sketch of orthodoxy, Catholicism and unification in Belarus and Lithuania, from ancient times to the present (Chapter III). [Electronic resource] / G. Ya. Kiprianovich // zapadrus.su. – Access mode: https://zapadrus.su/bibli/istfbid/1229-g-ya-kiprianovich-istoricheskij-ocherk-pravoslaviya-katolichestva-i-unii-v-belorussii-i-litve-s-drevnejshego-do nastoyashchego-vremeni-glava-iii.html. – Access date: 21.12.2020. (In Russ).

6. Znosko, K. I. Historical Sketch Of The Church Union. Its Origin And Character. [Electronic resource] / K. I. Znosko // bookitut.ru / – Access mode: https: //bookitut.ru/Istoricheskij-ocherk-Czerkovnoj-unii-Ee-proiskhozhdenie-i-kharakter.36.html#a36.Glava-XI-XVI . – Access date: 20.12.2020. (In Russ).

7. Charopko, V. K. Yazep Rutsky (1574–1637) [Electronic resource] / V. K. Charopko // – Access mode: http://zviazda.by/be/news/20190520/1558361869-yazep-rucki-stvaralnik-uniyackay-carkvy. – Access date: 22.12.2020. (In Belarus).

8. Morozova, S. V. Uniate system of Education. [Electronic resource] / S. V. Morozova // – Access mode: http://belchrist.narod.ru/pages/1_kanf_hist/16-18/uniackaja_adukac.htm. – Access date: 22.12.2020. (In Russ).

9. Saverchanka, I. V. Rutsky Yazep. [Electronic resource] / I. V. Saverchanka // – Access mode: http: //pawet.net/library/o_reflections/08b/Руцкі_Язэп.html. - access date: 28.01.2020. (In Belarus).

10. Saverchanka, I. V. Starazhytnaya Belarusian literature (XII–XVII stst.) / I. V. Saverchanka. Minsk : Knigazbor publ., 2007, 608 p. (in Russian). (In Belarus).


МГПУ им. И.П.Шамякина